**РАШЭННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ**
**“Аб зацвярджэнні палітыкі бяспекі**
**правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду”**

5 сакавіка 2026 года г. Варшава

У адпаведнасці з пунктам 5 Установчай дамовы ад 6 лютага 2026 года зацвярджаецца Палітыка бяспекі правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду:

## ПАЛІТЫКА БЯСПЕКІ
## Правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду

1. Палітыка распрацавана ў мэтах захавання бяспекі ўдзельнікаў мерапрыемстваў па выбарах у Каардынацыйную Раду (далей - выбарчы працэс), а таксама абароны правоў і свабод чалавека пры апрацоўцы персанальных данных, у тым ліку правоў на недатыкальнасць прыватнага жыцця, таямніцу галасавання, а таксама рэгламентацыі прынцыпаў і асноўных патрабаванняў да апрацоўкі персанальных данных у адпаведнасці з Агульным рэгламентам абароны персанальных данных (GDPR) Еўрапейскага Саюза.
2. Пры правядзенні выбарчага працэсу забяспечваюцца ўмовы, якія выключаюць уцечку персанальных данных асобам, органам і арганізацыям, якія не ўдзельнічаюць у правядзенні выбарчага працэсу. Апрацоўка данных ажыццяўляецца метадам псеўданімізацыі[1].
3. У выпадку ўцечкі персанальных данных асобам, якія не атрымалі адпаведнага дазволу на доступ да іх, збор персанальных дынных неадкладна спыняецца, усе атрыманыя падчас выбарчага працэсу персанальныя данныя неадкладна знішчаюцца, усе выбаршчыкі неадкладна інфармуюцца аб здарэнні.
4. Аб’ём персанальных данных, якія падлягаюць перадачы, абумоўлены неабходнасцю падцвердзіць прыналежнасць выбаршчыка да грамадзянства Рэспублікі Беларусь і залежыць ад абранага асобай спосабу ідэнтыфікацыі выбаршчыка.
5. Кожнай асобе, якая перадае свае персанальныя данныя, прапануецца азнаёміцца з дадзенай палітыкай бяспекі. Перадача персанальных данных павінна ажыццяўляцца толькі пры ўмовах надання на гэта згоды ў празрыстай і зразумелай форме з зазначэннем суб’екта, якому гэтыя данныя перадаюцца, а таксама падцвярджэння асобай аб азнаямленні з дадзенай палітыкай бяспекі.

[1] «Псеўданімізацыя» - апрацоўка персанальных данных такім чынам, што іх больш немагчыма аднесці да канкрэтнага суб'екта данных без выкарыстання дадатковай інфармацыі, пры ўмове, што такая дадатковая інфармацыя захоўваецца асобна, і ў дачыненні да яе прыняты тэхнічныя і арганізацыйныя меры, якія прадухіляюць яе аднясенне ідэнтыфікаванаму або якая індэтыфікуецца фізічнай асобе.

6. У мэтах абароны сваіх персанальных данных асоба мае права атрымаць доступ да сваіх персанальных данных, атрымаць інфармацыю, якая тычыцца апрацоўкі яе персанальных данных; патрабаваць выключэння ці выпраўленні няслушных ці няпоўных персанальных данных.

7. Выбарчая камісія у мэтах арганізацыі і правядзення выбарчага працэсу можа звяртацца да спецыялістаў у сферы лічбавай бяспекі і прыцягваць іх у якасці працэсараў пры ўмове падпісання імі дадзенай палітыкі бяспекі.

8. Выбаршчык мае права даць згоду на доступ да персанальных данных неабмежаванаму колу назіральнікаў за выбарамі ў Каардынацыйную Раду. У такім выпадку назіральнікі атрымліваюць права доступу да персанальных данных толькі ў мэтах праверкі адпаведнасці волевыяўлення выбаршчыкаў і ў неабходным для праверкі аб'ёме, пры гэтым не маючы права захоўваць і распаўсюджваць атрыманыя данныя. Умовай допуску назіральнікаў да выбарчага працэсу з'яўляецца падпісанне дадзенай палітыкі бяспекі. Удзел назіральнікаў у выбарчым працэсе рэгламентуецца адпаведным Палажэннем.

9. Тэрмін захавання персанальных данных абмяжоўваецца выбарчым працэсам. Пасля вычарпання магчымасцяў абскарджання выніковага рашэння па выбарах у Каардынацыйную Раду ўсе атрыманыя персанальныя данныя выдаляюцца цягам 24 гадзін. Па рашэнні Выбарчай камісіі ў мэтах бяспекі персанальныя данныя могуць быць выдалены да гэтага тэрміну.

10. Пры выяўленні несапраўднасці персанальных данных, яны неадкладна выдаляюцца, а голас, аддадзены выбаршчыкам, не ўлічваецца.

**Старшыня Выбарчай Камісіі**  **Алена Прыходзька**